На жаль, у рэцэнзаванай кнізе выказаны шэраг памылковых сцверджанняў, дзіўным чынам выкладаецца тая або іншая аргументацыя. Так, у прадмове гаворыцца, што ў пэўныя часы імя Г. Шкляра «знікала» з «навукова-інфармацыйных крыніц», двойчы сцвярджаецца, што беларусістычныя працы Г. Шкляра не згадваюцца нават у бібліяграфічных даведніках. Гэта не так. Як навуковец, які працаваў у беларусістыцы «па абавязку службы» толькі тры гады, як суаўтар старых падручнікаў, на змену якім прыйшлі некалькі пакаленняў новых, як чалавек, які не абараніў дысертацыі, не пакінуў па сабе ніводнай манаграфіі, не ўваходзіў у навуковую наменклатуру, Г. Шкляр і не можа быць асабліва вядомым беларусістам. Яго працы, насуперак В. Курцовай, тым не менш вядомыя спецыялістам, яны адлюстраваны ў бібліяграфічным указальніку «Беларускае мовазнаўства» 1967 г., разглядаюцца ў працы Л. Шакуна «Гісторыя беларускага мовазнаўства», выкарыстоўваюцца ў іншых крыніцах.

Пасля ўказання на тое, што ў ліпені 1942 г. Г. Шкляр быў прызначаны кіраўніком праекта беларуска-рускага слоўніка, В. Курцова разважае, чаму для гэтай работы была абрана менавіта яго кандыдатура. Перабіраюцца такія акалічнасці: з 1937 г. на АН БССР абрынуліся рэпрэсіі, кадраў не хапала, Г. Шкляр ужо кіраваў падрыхтоўкай слоўніка ў 1940–1941 гг., лінгвіста асабіста ведаў віцэ-прэзідэнт АН БССР Я. Колас, пра мову твораў якога Г. Шкляр раней напісаў навуковую працу. Дзіўна, але, здавалася б, найбольш відавочны аргумент – Г. Шкляр ужо кіраваў работай над слоўнікам раней і быў абазнаны ў гэтай справе – інтэрпрэтуецца як менш значны на фоне, як справядліва адзначана, «суб’ектыўнага пункта гледжання» беларускай рэдактаркі тома аб верагоднай пратэкцыі Г. Шкляру з боку Я. Коласа (с. 24).

Архіўныя дакументы ў рэцэнзаваным зборніку пададзены не заўсёды дакладна. Прозвішча прысутнага на пасяджэнні Прэзідыума Беларускай акадэміі навук 12 студзеня 1931 г. вучонага сакратара Інстытута мовазнаўства Я. Мацюкевіча памылкова прачытана як «Кацюкевіч». Памылкова датавана адно з пасяджэнняў Прэзідыума Беларускай акадэміі навук: замест 21 лістапада 1933 г. мае быць 21 лютага. Апублікаваныя ў зборніку выпіскі з асабовай справы Г. Шкляра не заўсёды даюць магчымасць устанавіць даты некаторых дакументаў. У кнізе не ўказаны звесткі пра месца захавання гэтай асабовай справы.

У сукупнасці публікацыя тома выбраных прац Г. Шкляра з’яўляецца важным дасягненнем у сучасным даследаванні гісторыі беларускага мовазнаўства. У зборніку рэпрэзентатыўна прадстаўлена беларусістычная і русістычная мовазнаўчая спадчына Г. Шкляра, згаданы гебраістычныя працы. Кніга будзе асабліва цікавай спецыялістам у гісторыі лінгвістыкі, лексічнай тыпалогіі, сінтаксіса, дыялекталогіі і інш.

***С. М. Запрудскі***[12]

*Семешко Л.* **Белорусский язык для китайских студентов. Элементарный уровень = 白俄罗斯语（面向中国学生）（初级）.** Минск : Изд. центр БГУ, 2021. 288 с.: ил.

*Сямешка Л.* **Беларуская мова для кітайскіх студэнтаў. Пачатковы ўзровень = 白俄罗斯语（面向中国学生）（初级）.** Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2021. 288 с.: іл.

*Semeshko L.* **Belarusian language for Chinese students. Elementary level = 白俄罗斯语（面向中国学生）（初级）.** Minsk : Belarusian State Univ. publ. center, 2021. 88 p.: il. (in Belarus.).

Навучальны дапаможнік Л. І. Сямешкі «Беларуская мова для кітайскіх студэнтаў. Пачатковы ўзровень», які выйшаў у Выдавецкім цэнтры БДУ, – гэта першае ў рэспубліцы выданне для замежных навучэнцаў, якое адпавядае агульнаеўрапейскім стандартам узроўневага навучання беларускай мове як замежнай, а дакладней, яе першаму ўзроўню (A1), пра што і сведчыць падзагаловак кнігі. Гэта свайго роду трыгер і ўзор для стварэння падобных (вельмі якасных!) дапаможнікаў па беларускай мове як замежнай у адпаведнасці з сертыфікацыйнымі ўзроўнямі.

Тое, што Лідзія Іванаўна стала тут першапраходцам, у людзей, якія працуюць у гэтай галіне, не выклікае здзіўлення, паколькі менавіта пры яе кіраванні кафедрай сучаснай беларускай мовы (1997–2001) на філалагічным факультэце БДУ, папершае, была ўведзена спецыялізацыя «Беларуская

[12]*Сергей Николаевич Запрудский* – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Сяргей Мікалаевіч Запрудскі* – кандыдат філалагічных навук, дацэнт; дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Siarhiej M. Zaprudski*, PhD (philology), docent; associate professor at the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University.

E-mail: *zaprudski@gmail.com*

CC BY NC

мова як замежная», распрацаваны адпаведныя праграмы і курсы; па-другое, узнавіла працу летняя школа беларусістыкі (1999); па-трэцяе, самая пільная ўвага надавалася выкладанню беларускай мовы іншафонам з рознай ступенню іх падрыхтаванасці (ад элементарнага ўзроўню да высокага). А ў 2016 г. ужо ў якасці прафесара РІВШ БДУ менавіта Л. І. Сямашка выступіла ініцыятарам і кіраўніком навуковага праекта па падрыхтоўцы Дзяржаўнага адукацыйнага стандарту па беларускай мове як замежнай, які распрацоўваўся ў адпаведнасці з дакументам *Агульнаеўрапейскія кампетэнцыі валодання замежнай мовай: вывучэнне, выкладанне, ацэнка* (*Common European Framework of Reference for Languages: Learning, Teaching, Assessment*) і быў паспяхова завершаны ў 2020 г. Вынікам працы калектыву стала не толькі стварэнне нацыянальнай сістэмы ацэнкі ўзроўняў моўнай кампетэнцыі па беларускай мове як замежнай (узроўні А1, А2, В1, В2, С1, С2 – агульнае валоданне), але і падрыхтоўка ў адпаведнасці з ёй і выданне лексічных мінімумаў (узроўні А і В), а таксама тыпавых тэстаў па беларускай мове як замежнай (узроўні А і В) па чатырох відах маўленчай дзейнасці (чытанне, пісьмо, аўдзіраванне, гаварэнне). Таму цалкам заканамерна, што працягам такой плённай і выніковай працы стала публікацыя дапаможніка для навучання беларускай мове на пачатковым узроўні. Тое, што дапаможнік скіраваны на кітайскую аўдыторыю, таксама не выпадкова: у Кітаі сёння працуюць 17 цэнтраў беларускай мовы і культуры; акрамя таго, кітайскі бок прафінансаваў само выданне.

Ужо толькі ўзяўшы кнігу ў рукі, можна сказаць, што дызайн-структура дапаможніка скрупулёзна прадумана аўтарам ад смайлікаў і іконак, малюнкаў, партрэтаў і фотаздымкаў, схем і табліц да колеравага вылучэння на старонцы найбольш важных правіл, або пэўных звестак у табліцы, або ўзораў выканання задання, або канструкцый на запамінанне і пад. Гэта цудоўна ілюстраванае выданне, надрукаванае на якаснай паперы, вельмі нагляднае, «прасторнае», а таму чытабельнае, разлічанае на якаснае візуальнае ўспрыманне, лёгкае і надзейнае запамінанне і дарэчнае выкарыстанне пададзенага матэрыялу.

Зместавая структура кнігі вытрымана ў найлепшых канонах метадычнай літаратуры: ад простага да складанага праз паўтарэнне і замацаванне ўжо вядомага. Дапаможнік уключае два раздзелы, строга вытрыманыя ў сваёй будове. «Уводна-фанетычны курс» складаецца з уводнай часткі пра беларускі алфавіт, фанетыку, інтанацыю (на прыкладзе элементарных сказаў), артыкуляцыю гукаў, базавыя звесткі пра граматыку беларускай мовы і ўласна шасці заняткаў, накіраваных на адпрацоўку вымаўлення, пісьма і гаварэння. Асноўная частка ахоплівае 18 тэматычных урокаў: «Як Вас завуць?», «Прыемна пазнаёміцца», «Колькі Вам гадоў?», «Адкуль Вы?», «Ваша сям’я», «Рэчы, якія Вы маеце», «Ваша праца», «Колькі часу?», «Ваш дзень», «Ваш тыдзень», «Месяцы і поры года», «Апісваем горад», «Апісваем мясціны», «Ваш дом і рэчы», «Ежа і напоі», «Адзенне і аксесуары», «Ваша вучоба», «Ваш вольны час». Увесь змешчаны ў занятках матэрыял арыентаваны на вырашэнне камунікацыйных задач – адпрацоўку навыкаў маўлення па-беларуску ў стэрэатыпных жыццёвых сітуацыях. І таму вельмі шкада, што кніга не мае аўдыядадатку (на CD ці па QR-кодзе) на выпрацоўку беларускага вымаўлення і навыку ўспрымаць маўленне з голасу, што значна спрасціла б для навучэнцаў самастойную працу.

У першай частцы кнігі выразна паказаны суадносіны гукаў і літар, што, несумненна, дапаможа кітайскім навучэнцам, для якіх гука-літарнае пісьмо зусім нязвыклае, добра засвоіць беларускую графіку, палегчыць далейшае чытанне і пісьмо. Паспрыяюць гэтаму і сціслыя, але ёмістыя каментарыі на кітайскай мове, а таксама магчымасць вучыцца пісаць літары, склады, словы і фразы ў самім дапаможніку. Бясспрэчнай ухвалы заслугоўвае пільная ўвага да рытму вымаўлення слоў і націску, што вельмі няпроста засвойваецца кітайскімі студэнтамі, як і правільнае інтанаванне беларускіх сказаў, апавядальных, пытальных, клічных.

Ужо з першых заняткаў у асноўнай частцы кнігі выкладаецца маўленчы этыкет з лінгвакультурнымі каментарыямі, што дапаможа кітайскім студэнтам лепш арыентавацца ў беларускамоўным атачэнні, навучыцца адэкватна паводзіць сябе ў залежнасці ад сітуацыі маўлення, дасягаць пастаўленай камунікацыйнай мэты. І да ветлівых зваротаў, і да выказванняў у цэлым праз усю другую частку паслядоўна прыводзяцца наглядныя мадэлі сказаў, даюцца сінанімічныя канструкцыі для розных сітуацый камунікацыі, што, бясспрэчна, дасць магчымасць кітайскім навучэнцам лягчэй і хутчэй падбіраць вывучаныя выказванні ў залежнасці ад камунікатыўнай задачы ў рэальным жыцці.

Важна ўказаць і на тое, што граматычны матэрыял у кожных занятках пададзены аўтарам сцісла і даходліва – праз канкрэтныя прыклады ў табліцах; тым самым зроблена спроба пазбегнуць дэталёвага тлумачэння «страшных» для кітайскіх студэнтаў граматычных правіл, што ў пэўнай ступені павінна зняць у навучэнцаў псіхалагічную нагрузку і дапамагчы ім пры вывучэнні і разуменні граматыкі беларускай мовы.

Матэрыял дапаможніка сведчыць пра вельмі карпатлівую, прадуманую працу аўтара над кожнымі заняткамі, іх лексічным, граматычным, тэкставым, сітуацыйна-камунікатыўным напаўненнем, дзе няма нічога лішняга, усе заданні і практыкаванні лагічна вынікаюць адно з аднаго і перацякаюць адно ў другое.

Аднак пры ўсёй абсалютнай прадуманасці падачы матэрыялу, строгасці і вытрыманасці афармлення дапаможніка ў ім ёсць і такія моманты, на якія варта было б звярнуць увагу пры яго перавыданні. Найперш гэта адсутнасць паслядоўнасці ў пастаноўцы націску: для пачатковага ўзроўню націскі патрэбныя як у кожным слове, так і ў кожным фанетычным слове фразы для засваення правільнасці і вымаўлення, і інтанавання выказвання ў цэлым.

Дапаможнік, як было адзначана вышэй, камунікатыўна арыентаваны, скіраваны на тое, каб дапамагчы студэнтам справіцца з камунікатыўнымі задачамі ў рэальным жыцці. У гэтым несумненная перавага і сіла падручніка, але тут можа быць і пэўная яго ўразлівасць. *Можа быць* – гэта сумненне, якое не падмацавана на дадзены момант самой апрабацыяй дапаможніка (ён толькі-толькі пабачыў свет), а грунтуецца выключна на досведзе папярэдняга выкладання. Улічваючы, што ў кітайскай мове няма граматычных форм (скланенне, спражэнне, трыванне і пад.), разуменне, засваенне і выкарыстанне сістэмы канчаткаў у беларускай мове для кітайцаў няпростае. Таму да гэтага дапаможніка напрошваецца граматычны дадатак як асобнае выданне (напрыклад, у выглядзе рабочага сшытка), дзе былі б пададзены практыкаванні на адпрацоўку спражэння дзеясловаў узроўню А1, паколькі гэта самая складаная для асэнсавання і засваення тэма: выпадзенне суфіксаў у асабовых формах, чаргаванні галосных і зычных у аснове, рухомы націск і, адпаведна, змена фанетычнай абалонкі слова. Таму важна з самага пачатку (па магчымасці) даводзіць гэту граматычную з'яву да аўтаматызму (напрыклад, *глядзéць – я гляджý*, *мы глядзíм*, *вы гледзіцé*; *ісцí – я ідý*, *мы ідзём*, *вы ідзяцé*; *хацéць – я хачý*, *ты хóчаш*, *яны хóчуць*) і ў вусным спражэнні, і ў выкарыстанні ў выказванні ці дыялогу. У кнізе, зразумела, ёсць такія практыкаванні, але колькасць сказаў у іх недастатковая (толькі па 5 пазіцый), што таксама вытлумачальна: ёсць абмежаванне ў аб'ёме самога выдання. Таму дадатковыя матэрыялы, падрыхтаваныя на прафесіянальным узроўні ў адпаведнасці з тэматычнымі заняткамі дапаможніка, былі б цудоўнай дапамогай выкладчыку, асабліва пачаткоўцу. Само ж выданне адпавядае стандарту пачатковага ўзроўню авалодання беларускай мовай, і больш глыбокае знаёмства з граматыкай разлічана на наступныя ўзроўні, але замацаванне пачатковых граматычных навыкаў нароўні з камунікатыўнымі толькі ўзмацняе веды навучэнцаў і скіроўвае іх да больш усвядомленага асэнсавання сістэмы спражэння ў беларускай мове. Зразумела, што гэта толькі пажаданне на будучыню.

Нягледзячы на тое што дапаможнік у цэлым строга афармлены, у тэксце на кітайскай мове сустракаюцца перакладныя памылкі. Адны з іх, на наш погляд, скажаюць арыгінальны тэкст аўтара, часам не вельмі зразумелыя для кітайцаў і ў нейкай ступені могуць нават заблытаць іх; а іншыя, перадаючы асноўны сэнс, не адпавядаюць стылістычным патрабаванням кітайскай мовы. На с. 56 прапушчаны загаловак «ЗАНЯТКІ 5 第五课».

Выяўленыя пры азнаямленні з кнігай некаторыя недагляды, спадзяёмся, толькі паспрыяюць яе паляпшэнню пры перавыданні, чаго яна дакладна заслугоўвае, бо наклад у 100 асобнікаў падаецца занадта мізэрным для так прафесіянальна ўкладзенага і з любоўю падрыхтаванага дапаможніка. Перавыданне неабходнае і таму, што гэта цудоўны прыклад для стварэння вучэбных дапаможнікаў у адпаведнасці з распрацаванай нацыянальнай сістэмай ацэнкі ўзроўняў моўнай кампетэнцыі па беларускай мове як замежнай.

***Т. Р. Рамза***[1], ***Сюй Байлун***[2]

[1]*Татьяна Ростиславовна Рамза* – доктор филологических наук, доцент; профессор кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета.
*Таццяна Расціславаўна Рамза* – доктар філалагічных навук, дацэнт; прафесар кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.
*Tatsiana R. Ramza*, doctor of science (philology), docent; professor at the department of the Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University.
E-mail: *ramza@bsu.by*
[2]*Сюй Байлун* – независимый исследователь.
*Сюй Байлун* – незалежны даследчык.
*Xu Bailong*, independent researcher.
E-mail: *672227214@qq.com*